View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Адамовіч Г.Я.**

**Рэцэнзія: В глубь образа**: Алесь Разанаў. Шлях-360. Мінск: Маст.літ., 1981

Адамович, Г.Е. В глубь образа: Алесь Разанаў. Шлях-360. Мінск: Маст.літ., 1981 / Г.Е. Адамович // Неман – 1982. – № 12. – С. 151–153 (пераклад мой – Г.А.).

У першым вершы Алеся Разанава “Пошук”, апублікаваным у 1966 годзе, нечакана дакладна аўтарам быў знойдзены асноўны матыў, які пазней пройдзе праз яго зборнікі “Адраджэнне” (1970 г.), “Назаўжды” (1974 г.), “Каардынаты быцця” (1976 г.), – матыў пошуку як пастаяннага абнаўлення, самасцвярджэння: “я маю права ўсё закрэсліць і потым нанава пачаць”.

Алесь Разанаў – паэт філасофскага складу. Філасофская праблематыка для яго з’яўляецца не толькі імпульсам вобразнага мыслення, але і яго мэтай – самапазнаннем. І гэта мастацкае самапазнанне ажыццяўляеццак А.Разанавым у працэсе пошуку адказу на “вечныя” пытанні быцця і сцвярджэння сваёй чалавечай асобы, у асэнсаванні “макракосму” чалавечага сусвету і ва ўключэнні ў яго “мікракосму” асобнага індывідуума. Пошук, рух – жыццёвы, “вегетатыўны” нерв і новай кнігі. І таму “шлях-360” не ёсць вобраз завершанасці, некай ужо сцвярдзелай, застыглай формы існага. Гэта – вобраз чалавечага развіцця, у якім адлюстравана бясконцасць самога чалавека – бесперапыннае паглыбленне ў самога сябе і пошук новых межаў самавыяўлення, выйсце ў акаляючы свет і раскрыццё шматстайных форм існавання.

Пра гэта – “Першая паэма шляху”. Той, хто “я сам сабе не ведаю імёнаў”, спрабуе вырвацца з палону небыцця, пераадолець пеляну (“сутонне”), сон, які скаваў яго, і ўсвядоміць сябе (“кім я ёсць?! І кім не ёсць?!”). Працэс станаўленне чалавека – пераадоленне немагчымасці выказаць сябе ў словах (“я заўжды маўчаў і голасу свайго не чуў ніколі”) – пакутліва доўгі (“…Я голас выдзіраў з сябе: бы плеўку, нібы хваробу…”). На шляху самапазнання ўзнікаюць дзве сілы, якія раздзіраюць чалавечую істоту, – дзве яго часткі: цела і душа. Цела корчыцца ў пакутах, цела “крычала моўчкі”. Душа ж, прызначаная для вышэйшага, вытрымала выпрабаванне (“я той, хто не свіння”, “я той, хто не сабака”), набыла свой голас, знайшла свій шлях. У барацьбе за званне Чалавека душа атрымлівае перамогу – гэта перамога чалавечага розуму, які прабівае сабе шлях і імкнецца па ім: “я той, хто шлях і хто па ім ідзе”.

“Фіо, эрго нон сум” – “Я станаўлюся, значыць, не есмь” – “Я созидаюсь, меня еще нет” (Вяч. Іваноў) – “Я той, хто шлях…” І гэты працэс бясконцы, таму што кожны раз пачынаецца наноў – працэс самапазнання, самасцвярджэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У аналагічным ключы – лёс чалавека на вагах часу (“ці доўга вагам калыхацца лёс разважае”), імгненнасці чалавечага жыцця (“незаўважны крок”) – пабудавана другая квантэма першага раздзела кнігі.

На міфалагічных уяўленнях аб п*а*рках, якія ткуць ніці чалавечага лёсу, заснаваны вобразы верша “Свечкі”. Згодна з нямецкім фальклорам, даўжыня чалавечага жыцця залежыць ад часу гарэння свечкі, казачная жанчына ўладарыць над жыццём і смерцю. Лёс героя А.Разанава ў руках жанчыны зямной. Яна, каханне, – вырашальніца яго лёсу.

Алеся Разанава па маштабам пранікнення ва ўнутранае жыццё чалавека можна назваць паэтам “касмічным” – але які вядзе не ў вышыню (да касмічных аб’ектаў, па словах крытыка У. Калесніка), але да самога сябе, у пазнанні “космаса” ў чалавеку.

У першай кнізе “Адраджэнне”паэт зваў да вытокаў, якія бяруць пачатак на “малой радзіме” чалавека: “Там маленства чалавецтва, там пачатак, там выток”. І ён разглядае яе, “малую радзіму”, як повад для размовы, як штуршок для самапазнання. У зборніку “Назаўжды” аўтар далей развівае тэму, скіроўваючы погляд у будучыню, разважае пра мінулае і сучаснае, пра сыходзячае і вечнае. Яму важна вызначыць “каардынаты быцця” чалавека, яго месца на зямлі і яго незаменнасць. Простае чалавечае быццё А. Разанаў узводзіць у ранг “высокай” паэзіі – паэзіі інтэлектуальнай, глыбока філасофскай. І асноўная, дамінуючая інтанацыя ў ёй – спавядальная. У “Шляху-360” лірычная споведзь шматгалосая, але ў гэтым шматгалоссі ёсць агульная падаснова – усё тое ж палкае жаданне героя спасцігнуць сэнс свайго існавання.

Лёс гарбуна ў “Паэме рэха” – яго горб (“І стаўся лёсам тваім горб”). Дзіця не зусім разумела, пра што перамаўляюцца бацькі, – здагадвалася. Але здагадка сыходзіла, і ён гуляў разам з іншымі дзецьмі. Але перамагаць у гэтых гульнях не мог: “Карпеч”, – злосна крычалі дзеці. І ўжо нікім не хацелася быць: ні чэмпіёнам, ні леснікoм, ні генералам. Не жыць улітцы без сваёй ракавіны, не скінуць хлопчыку з сябе сваю ношу. А калі ён разам з усімі смяяўся над сляпой Юляй, якую болей за ўсіх зневажалі ў вёсцы, раптам аднойчы зразумеў, што гэта смех і над ім таксама. “Паэма рэха” – псіхалагічны малюнак уяўлення пра сябе, пра сваё няшчасце і лёс, што складваецца ў свядомасці хлопчыка.

Спасцігаючы глыбіні чалавечых станаў, паэт быццам сам поўны круг людскіх лёсаў перадывае (“Завязаліся ўва мне, бы мае, чыесці жыцці”). У Разанава хісткая і амаль няўлоўная мяжа паміж жывымі і памерлымі, памяццю і бяспамяцтвам, паміж цемрай і святлом, сустрэчай і расстаннем, паміж запісаным і сцёртым. У вобразе “Шляха-360” вырастае праступае вобраз супярэчлівага і шматаблічнага адзінства.

Два вобразы “Паэмы палявання” – пастуха і паляўнічага, пабудаваных на біблейскай аснове, – гэта па сутнасці расшчапленне адзінага вобраза – шляху чалавечага. У аснове гэтага расшчаплення – супрацьлегласцьнапрамкаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

функцый: “калі свет весці – што весці, калі ісці за светам – за чым ісці?” Пастух вядзе статак, паляўнічы крадзецца ўслед. Пастух вартуе, ахоўвае статак, паляўнічы палюе – нападае.

Але ж – перакрыжоўваюцца ролі, лёсы, шляхі. Жыццё пераплятаецца са смерцю, вядучым – з тым, каго вядуць. Такі шлях Сурмача, які быў паляўнічым, а стаў пастухом. Забіваючы звера, Сурмач успомніў, як сам у дзяцінстве спрабаваў абараніцца ад гаспадара: “я добры… я добры… Спытайцеся ў мамы: я добры…”

Чалавек бездапаможны перад лёсам у часы нараджэння і смерці: “… хіба я хацеў нарадзіцца – мяне нарадзілі…”, “…хіба я хачу памерці – мяне памруць” І толькі на гэтым адрэзку – паміж жыццём і смерцю – чалавек вольны выбіраць, кім яму быць: паляўнічым ці пастухом, самім сабою ці кімсьці замест сябе – “заступнікам” (“пэўна самога сябе заступіў…”). Вобраз-думка “Паэмы палявання” – змястоўнасць асобнага чалавечага жыцця, выкананне чалавекам на зямлі свайго прызначэння і заканамернасць яго адыходу: “Я пайду і нічога больш не парушу: ты, сонца, свяці-свяці, ты, лісток, зеляней…”

Першыя радкі “Другой паэмы шляху” – таксама акрэсліваюць шлях чалавека на зямлі, прысутнасць у часе і прасторы, нараджэнне, рух дзён, ход сонца на небе:

Я ў хаце быў –
у ёй чакаю:
сам
знайшоўся ў ёй, а часам забываўся,
і крэсліў рыскі ў шэраг на сцяне
і назіраў, як адхіляўся промень…

Паэт развівае тэму, пачатак якой – у “Першай паэме шляху”, “Паэме палявання”: “чаго мы хочам, з-за чаго ідзём, чаму нідзе не можам прыпыніцца”.

Працягваючы характэрную для беларускай літаратуры традыцыю філасофскага асэнсавання рэчаіснасці на матэрыяле народнага быцця, А.Разанаў паглыбляе яе адлюстраваннем маральнага свету сучасніка, які наследуе духоўныя заваёвы свайго народа, што ўспрыняў багатую культуру чалавецтва. На ўплыў паэзіі П.Элюара, Л.Арагона, П.Неруды на творчасць А.Разанаў звяртаў увагу П.Панчанка, на ўплыў сюррэалістаў – А.Клышка, беларускага паэта В.Хадыкі – В.Бечык. Але літаратурных і філасофскіх крыніц творчасці Алеся Разанава значна болей. Сюды можна ўключыць і паэзію Р.М.Рыльке, Б.Пастэрнака, У.Уітмена, і філасофію ўсходніх народаў, і фальклор. І размова, зразумела, ідзе не пра запазычанні паэта з арыгіналаў. Хоць асваенне пракладзеных шляхоў – таксама пошук, калі ён вядзецца з пазіцый арыгінальнай творчасці, нацыянальных інтарэсаў. Тут у А.Разанава свой настаўнік – класік беларускай літаратуры М.Багдановіч, які далучыў нацыянальную культуру да вяршынных дасягненняў культуры сусветнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэзія А.Разанава – паэзія сэнсавых кантрастаў, славеснага праціборства, укавых алітэрацый. Аўтар глыбока адчувае гучнасць і ёмістасць беларускага слова. Радок “І верад свой я ў словы пераклаў…” просты і меладычны. “Верад” – “нарыў”6 ранейшае абласное слова цяпер трывала замацавалася ў беларускай літаратурнай мове. “Верад” гучыць і праглядаецца як “вера” – вера балючая, боль веруючая…

А.Клышка адзначыў заўважную асаблівасць развіцця паэтычнай думкі ў А.Разпанава: свядомасць асацыяцый, часты прыём нанізвання строфаў: “Калі паэт сказаў пра мяцеліцу, што яна “заклятая ў немаце”, дык гэта немата ў наступным радку загаворыць:

Заклятая ў немаце,
што выкажа –
не забуду…”

Гэтым беларускі крытык тлумачыць “звычайнае фармальнае проціпастаўленне слоў”. Пойдзем далей. А.Разанаў разломвае вобраз на сэнсы, сутыкаючы дзве яго іпастасі: пачатак і канец, наяўнасць і адсутнасць, актыўнасць і пасіўнасць і г.д. Вынікам гэтага з’яўляецца пашырэнне шмазначнасці вобраза, дваістасць яго сімволікі, што дазваляе развіваць паралельна два матывы: жыцця і смерці, дабра і зла, імгнення і вечнасці.

Круціўся хмыз.
Бяссувязны язык
хваліў жыццё.
Заблытаныя святы.
Празрэнні апярэджвалі разлік.
А людзі разумелі:
блазнаваты.
Клаў вогнішчы,
Сам побач клаўся.
Дым шукаў сваё.
Шаптала штосьці лета.
А над шурпатым розумам тваім
згушчаліся зіхоткія сусветы.

У дэфармаванай свядомасці юродзівага (“Паэма запаленых свечак”) зблыталіся думкі, рэчаіснасць і сон, адкрытае і патаемнае. І нешта яму больш зразумела, чым усім, але выказаць гэта надзвычай цяжка. І тут зноў прысутнічае пошук – пошук “слова”, якое змяшчае важную для героя жыццёвую ісціну, раўназначную яго самасцвярджэнню, вызначэнню свайго месца ў жыцці.

Паэмы, вершы А.Разанава, не зусім зразумелыя пры першым прачытанні, робяцца блізкімі, як быццам расхіляюцца насустрач твайму ўяўленню, калі чытаеш іх не спяшаючыся, удумваючыся ў слова, складаючы фразу з бліжэйшых слоў у адпаведнасці з выклiканымі асацыяцыямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хто ён памёр не такі
як дрэва
усе нараджаюцца тут
і цяпер
у іншых інакш:
бараніцца – ў спадкі
за абаронцам –
лёс…

(Хто ён? Памёр не такі.
Як дрэва,
усе нараджаюцца тут
І цяпер
у іншых інакш:
бараніцца – ў спадкі,
за абаронцам –
лёс…)

Чытач тут узбагачае аўтарскі тэкст менавіта сваім прачытаннем, магчыма, не заўсёды аднолькавым, які залежыць ад агульнага ўспрымання твора, ад эмацыйнага настрою, ад эстэтычнай падрыхтоўкі. Чытач – ён жа і сааўтар тэкста. Актывізацыя ўзаемасувязі “аўтар – чытач” у Разанава вядзе да новага віду сінтэза раздробленага на дэталі мастацкага свету паэта, раз’ятага на псіхалагічныя фрагменты духоўнага жыцця яго герояў.

Частковае або поўнае адмаўленне А.Разанава ад знакаў прыпынку пашырае і – часам нават празмерна – ускладняе асацыятыўныя структуры верша, яго сэнсавыя функцыі. У паэтычным эцюдзе “З-пад рукі” словы, не звязаныя паміж сабой логікай развіцця цэласнага вобраза, нараджаюць урывачныя малюнкі, варыятыўныя дамінанты: таго, хто/што чакае і сышло, хто/што мае і страціў, хто/што падзяляе і не набыў. Скрозь празрыстасць формы праступае стрыжань зместу: надзея лірычнага героя на шчасце,якое стала далёкім і немагчымым, на ўзаемаразуменне і разам з тым адчужанасць, расчараванне, страта. Асобныя штрыхі, прыкметы вобразаў спалучаюцца паміж сабой адвольна (хоць і гэта адвольнасць падпарадкавана пэўнаму сэнсу), складаючы рухомую мазаіку. У гэтым “калейдаскопе” вобразаў згадваюцца адчай і боль страты, успышка горкіх пачуццяў, шкадаванне аб надзеях, што не збыліся, аб веры, што прайшла.

У гэтым эцюдзе выявіліся і непазбежныя выдаткі творчых пошукаў (пэўна, як іх заканамернасць) Алеся Разанава. Гэтыя выдаткі – некаторая штучнасць асацыяцый, ускладнёнасць канструкцый. Асобныя вобразы надта разрозненыя і не складваюцца ў адзінае цэлае, асацыяцыі разарваныя і не выклікаюць таго ўяўлення, на якое разлічвае аўтар; яны абцяжарваюць думку аўтара, робяць яе відавочна заблытанай і таму меньш даступнай для ўспрыняцця. У многім гэта абумоўлена не заўсёды ўдалай спробай аўтара падняць суб’ектыўнае на ўзровень мастацкай творчасці. Але ў агульным і цэлым пошук А.Разанава надзвычай плённы.

Мастацкі свет зборніка “Шлях-360” шматгранны, рухомы. Ён складваецца ў непаўторны вобраз жыцця: “шлях-360” гэта не рух па колах, гэта рух ад небыцця да небыцця, шлях усяго жывога, заўважанага паэтам у многіх яе праявах – узнёслага і прыземленага, трагічнага і камічнага, вечнага і тленнага, таго, што нараджаецца і што памірае, – разгортваецца ў суб’ектыўную панараму хуткаплыннага быцця, дзе і адбываецца

самапазнанне, самасцвярджэння асобы. Сам паэт вяртаецца да вобраза “шляху” ў “Медытацыях наўзбоч “Шляху-360” (зборнік “Вобраз-81”), ён падкрэслівае разнастайнасць і бясконцасць яго, гэтага вобраза.

Творчасць А.Разанава – з’ява мастацкая і сама па сабе, і паказчык пэўнага ўзроўню сучаснай беларускай паэзіі, насычанай глыбокім філасофскім зместам, актыўным успрыняццем свайго часу, смелым пошукам новых шляхоў развіцця вобраза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ